ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

ЧАЦВЕР 24 КАСТРЫЧНІКА

№ 25(1689)

ПРАГНОЗ

## ПОЙДЗЕМ ДРУГІМ ШЛЯХАМ

Прадзіраючыся праз церніі апошніх грамадска-палітычных змен, шукаючы выйсце з замкнёнага кола праблем, работнікі Міністэрства народнай адукацыі рэспублікі прапаноўваюць сумесна вызначыць шлях правядзення рэформы выкладання гуманітарных і сацыяльна-палітычных дысцыплін у Беларусі. Іх праваднікі — супрацоўнікі праблемнай лабараторыі сацыялагічных даследванняў пры Белдзяржуніверсітэце — будуць арыентавацца на выніку апытання «невыпадковых» спадарожнікаў: прафесарска-выкладчыцкі састаў і студэнтаў універсітэта.

Першыя сустрэчныя — члены Вучонага савета універсітэта — ужо адказалі, «якія з сённяшніх недахопаў у выкладанні гуманітарных і сацыяльна-палітычных дысцыплін павінны быць ліквідаваны ў першую чаргу», «да якіх вынікаў можа прывесці перавод выкладання іх на факультатыў», а таксама на іншыя пытанні анкеты.

АДДЗЯЛЕННЕ СУВЯЗІ

## ПЕРАШКОДЫ, ПЕРАШКОДЫ...

Наш клас удзельнічае ў рэспубліканскім конкурсе «Зорка Венера», прысвечаным 100-годдзю з дня нараджэння Максіма Багдановіча. Вось і вырашылі мы наведаць горад дзяцінства паэта — Гародню.

Планы наконт экскурсіі былі вялікія, але большасць з іх мы так і не здзейснілі. Чаму? Аўтобус не прыйшоў. Заяўка была афармлена за тыдзень і падпісана прарэктарам універсітэта У. І. Тарасевічам, аднак, напэўна, для супрацоўнікаў гаража гэтага было недастаткова.

Але хіба гэта перашкода для нас? Падхапіўшы сумкі, пайшлі на вакзал. З перасадкамі, у дзве гадзіны ночы мы, нарэшце, дасягнулі мэты свайго вандравання. Начавалі на кватэрах сяброў нашага класнага кіраўніка Уладзіміра Іванавіча Куліковіча.

Раніцай у нядзелю нейкім цудам атрымалася набыць квіткі да Мінска. Экскурсія сарвалася, але ўсё ж хапіла часу пабываць на службе ў Францысканскім касцёле і, вядома, наведаць музей Максіма Багдановіча. Як высветлілася, амаль з пачатку існавання да нядаўняга часу ў музеі працавалі толькі яго загадчыца — Данута Янаўна Бічэль-Загнетава — ды прыбіральшчыца. Усе дакументы, экспанаты Данута Янаўна збірала адна: наладжвала перапіску, сустракалася з людзьмі, чыё жыццё нейкім чынам звязана з лёсам Максіма Багдановіча.

Зараз ёй дапамагае кваліфікаваны супрацоўнік, але, акрамя асветніцкай дзейнасці, яны павінны весці яшчэ судовую справу, каб пашырыць плошчы музея.

І вось міжволі паўстае пытанне: ці патрэбна людзям тое, што робіць Данута Янаўна? Безумоўна. Тады навошта ж, калі ўжо не дапамагаць, так старанна перашкаджаць ёй?

Наталля ЕЎДАКІМЕНКА,
вучаніца 10-га класа
МССШ-ліцэя пры БДУ.

ПАЛІТЫЧНЫ НЕБАСХІЛ

## Што такое ХБС?

«Хаўрус беларускамоўных студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта» (ХБС) — адна з многіх грамадскіх арганізацый у моры падобных. Хоць не, мэты ХБС, занатаваныя ў Статуце,— удзел у выкананні дзяржаўнай рэспубліканскай праграмы па развіццю беларускай мовы, сацыяльная абарона беларускамоўных студэнтаў, прапаганда сярод універсітэцкага студэнцтва гісторыі і культуры Беларусі, дапамога па ўладкаванню на работу беларускамоўных выпускнікоў. І ніякай палітыкі.

На Вольным Сойме сяброў, які з'яўляецца вышэйшым прадстаўнічым органам ХБС, 16 кастрычніка прысутнічалі 46 студэнтаў. Была абрана Рада «Хаўруса беларускамоўных студэнтаў БДУ» у складзе 11 чалавек, куды ўвайшлі прадстаўнікі 9 факультэтаў БДУ, і старшыня ХБС, якім стаў студэнт 4 курса гістарычнага факультэта Алесь Шавель. І ўвогуле гістфакаўцы ў нованароджанай арганізацыі складаюць трэцюю частку, а менавіта: 15 студэнтаў. Гэта, пэўна, больш, чым звычайная выпадковасць.

Звяртае на сябе ўвагу яшчэ адна цікавая акалічнасць. Старшыня ХБС займае гэткую ж пасаду і ў «Чырвоным Жондзе», а яго намеснік з'яўляецца сябрам рэспубліканскае арганізацыі «Задзіночанне Беларускіх Студэнтаў». І таму ўзнікае зусім натуральнае пытанне: ці не стане «Хаўрус» нейкім гібрыдам, ці зможа набыць і захаваць свой твар?

Арганізацыя пакуль афіцыйна не зарэгістраваная. Ды й не мае сталага месцазнаходжання. Хоць абяцаюць «Хаўрусу» ўласны пакой, мажліва, з тэлефонам.

Юрась ДУБІНА,
студэнт факультэта
журналістыкі.

ВЕДАЙ НАШЫХ!

## ВЫСТАВА, ЭКСПЕРТЫЗА, ВІЗА

70-годдзю Беларускага дзяржаўнага універсітэта была прысвечана выстава навукова-даследчых работ БДУ, якая праходзіла з 15 да 18 кастрычніка ў галоўным корпусе універсітэта.

Прылады, што скарыстоўваюцца ў медыцыне, электроніцы, раздзел тэхналогіі, дэманстраванне арыгінальных праграмных сродкаў — усяго больш за 100 экспанатаў.

Супрацоўніца аддзела навукова-тэхнічнай інфармацыі Валянціна Міхайлаўна КАРЧЭЎСКАЯ пазнаёміла нас з дзвюма прыладамі, якія з трынаццаці прадстаўленых у Маскве прайшлі камерцыйную экспертызу, выявіліся канкурэнтна-здольнымі на сусветным рынку і здабылі права ўдзельнічаць у Міжнароднай перасовачнай выставе.

ПА АБ'ЯВЕ

## СТУДЭНТ-НАСТАЎНІК?

*Малое прадпрыемства запрашала супрацоўнічаць у якасці рэпетытараў для навучэнцаў 1—4 і 5—8 класаў па ўсіх прадметах агульнаадукацыйнай школы, а таксама ў якасці кіраўнікоў гурткоў мастацкага цыкла, спартыўна-турысцкага, прыкладной творчасці студэнтаў старшых курсаў.*

*Паспрабаваўшы сёе-тое высветліць, я дазналася, што будзе атрымліваць «недавучаны» рэпетытар 20—25 рублёў за гадзіну працы, а бацькі патрацяць 3—4 рублі (за гадзіну навучання роднага дзіцяці, калі яно вучыцца у пачатковых класах) і 6—8 рублёў за вучня 5—8 класаў.*

*Ідэйка за рублі знайсці розум і ў той жа час міласэрдна дапамагчы беднаму студэнту прываблівае. Праўда, пры ўмове, што рэпетытар — талент. Як жа будзе праходзіць адбор? У адказ мяне суцешылі, што і багатых бацькоў, і заявак, і студэнтаў-рэпетытараў пакуль мала, а работа ўсім знойдзецца, былі б толькі здольнасці і жаданні.*

*Т. КАЗАК.*

ВЫ ЧУЛІ?

## І ЗНОЎ — У БОЙ!

На працягу апошніх некалькіх дзесяцігоддзяў раскоша і сапраўды толькі сніцца кіраўнікам універсітэта. Вось і на гэты раз чуткі пра тое, што вайскоўцы аддадуць пад вучэбныя аўдыторыі універсітэта памяшканні расфарміраванага палітычнага вучылішча, па ўсім відаць, не пацвердзяцца. У іх свае планы, дзе няма, на жаль, месца «цывільным» марам аб неабходных пятнаццаці квадратных метрах для кожнага студэнта ВНУ.

Ды й ці пра тое мы марылі, калі слухалі выступленне па радыё Старшыні Савета Міністраў рэспублікі В. Ф. Кебіча? Менш, чым на вышэйшую партыйную школу, перайменаваную нядаўна ў Інстытут паліталогіі, і не разлічвалі. Здаецца, і на гэты раз абяцанка-цацанка. Толькі верыць ёй мы ўжо стаміліся і гатовыя, нарэшце, да рашучых дзеянняў. Члены Вучонага савета на чале з рэктарам Ф. М. Капуцкім прынялі рашэнне аб звароце да Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. С. Шушкевіча, Старшыні камісіі па адукацыі, культуры і захаванню гістарычнай спадчыны Н. С. Гілевіча, Старшыні Савета Міністраў В. Ф. Кебіча.

Кропля камяні точыць. Магчыма, гэтая будзе апошняй і пераможнай у доўгай барацьбе за нармальнае існаванне флагмана вышэйшай школы рэспублікі.

ШТО НОВАГА?

## «Прадаецца жалейка!»





*Праўленне Саюза музычных дзеячоў Беларусі, Асацыяцыя майстроў па стварэнню музычных інструментаў, якая сёння аб'ядноўвае 70 майстроў, правялі выставу-продаж музычных інструментаў: смычковых, струнных, язычковых і ўдарна-шумавых.*

*Майстар! Гэта слова ахутана рамантыкай даўніны. У сваю работу майстар душу ўкладваў, паглядзіш на інструмент — а ён як жывы. Няшмат такіх майстроў засталося сёння. Вось і адшукваюць іх па ўсёй рэспубліцы, збіраюць, каб не згубіць апошняе, што захавалася. Бо з чым тады застанемся?*

*А старыя майстры, яны вялікі вопыт маюць: і дрэва падабраць, і гук пачуць. А таму і цаны няма іх работам. Вось, напрыклад, прадставіў І. Дударэвіч сваю скрыпку. Сціпла так: «Проста скрыпка». А даўней кожнаму інструменту, як чалавеку, імя давалі.*

*На аўкцыёне цікавая і сумная гісторыя здарылася. Скрыпку хацеў купіць хлопчык, ён з шасці гадоў іграе, у музычным ліцэі вучыцца, а інструмента не мае. Але яму не пашанцавала. Аўкцыён ёсць аўкцыён. Страсці разгарэліся, і купіў скрыпачку салідны чалавек з таўстым кашальком.*

*На аўкцыён прыйшлі не толькі музыканты, але і работнікі музеяў, прадстаўнікі творчых калектываў, настаўнікі музычных школ, таму што вучыць таленавітых дзяцей трэба на інструментах, зробленых таленавітымі рукамі. Тады і вынік будзе бачны.*

*Ганна ХАРУЖАЯ.*
*Фота С. ГРЫЦА.*



ПАДПІСКА-92

## «СУДЕБНЫЙ ВЕСТНИК»

Са студзеня 1992 года ўпершыню ў гісторыі нашай рэспублікі будзе выходзіць новы часопіс «Судебный вестник».

«Судебный вестник» — гэта перыядычнае выданне Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь, на старонках якога знойдуць адлюстраванне пытанні яго дзейнасці, прымяненне заканадаўства, судовых рашэнняў па канкрэтных справах, а таксама агляды судовай практыкі, адказы на запытанні судоў, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый. Тут жа чытачу прапануюцца каментарыі законаў, актуальных праблем судаводства і ўдасканалення заканадаўства, розныя парады, тлумачэнні, рэкамендацыі і адказы на пытанні.

«Судебный вестник» прадаставіць магчымасць вучоным, юрыстам-практыкам абмяняцца вопытам, ідэямі, выказаць прапановы, падзяліцца тым, што турбуе. Часопіс зверне ўвагу чытачоў і на прававыя праблемы, якія хвалююць не толькі прафесіяналаў, але і радавых грамадзян, прыцягне да развагі над імі і аб'яднае ў іх вырашэнні. Дзелавыя людзі маюць магчымасць надрукаваць тут рэкламу, інфармацыю, прапановы.

На старонках «Судебного вестника» вас чакаюць захапляючыя дэтэктыўныя гісторыі, нарысы, замалёўкі, сустрэчы з цікавымі субяседнікамі і, вядома,— гумар.

Індэкс «Судебного вестника» 74989, перыядычнасць выхаду — 4 нумары ў год, кошт гадавой падпіскі — 8 рублёў.

Пішыце нам на адрас: 220081, г. Мінск, вул. Леніна, 28, рэдакцыя часопіса «Судебный вестник».

ЗАПОЗНЕНАЯ РЭЦЭНЗІЯ

# Мы ў 30-я гады

Чалавек смяецца, развітваючыся са сваім мінулым. Таму, гартаючы газету «Ленінец» (прашчур «Беларускага універсітэта»), мне хацелася ад душы пасмяшыць вас загалоўкамі-лозунгамі накшталт заклікаў Астапа Бэндэра. У яго гучала: «Ударым аўтапрабегам па разгільдзяйству і бездарожжу. Усе ў аўтадор, таварышы!». А ў нас было: «За ліквідацыю хвастоў». Або: «За чоткае выкананне дырэктыў партыі». І такое: «За перабудову старога быту. Кожная жанчына павінна ўдзельнічаць у грамадскай працы. Усе на фронт сацыялістычнага будаўніцтва». І ўжо зусім рашуча: «Уцягнем у грамадскую працу жонак студэнтаў».

Мінулае можа быць прыемным тым, што назад ужо не вернецца. Але дзеля гэтага трэба папрацаваць. А пакуль што можна смяяцца над пыхлівымі і наіўнымі радкамі аднаго з дабрачынных карэспандэнтаў, які, напэўна, з-за працоўнай загружанасці падпісваўся надзвычай лаканічна: «Г.».

### СОРАМНА ТАК РАБІЦЬ

**У нас у Камвузе (былы БДУ) маюцца такія сябры партыі, якія ў час вялікага свята Першага мая адмовіліся несьці лёзунг нашай партыі ў працоўныя масы ў час дэманстрацыі. Нягледзячы на неаднаразовае распараджэнне камузводу т. Кунін ляпей ліча прайсьці па тратуару з дзяўчынай, чымся пранесьці лёзунг партыі ў шэрагах сваіх таварышаў.**

**Сорамна так рабіць, т. Кунін.**

Але сярод старога хламу іншы раз трапляюцца і добрыя ідэі, калі раптам высвятляецца, што нашы шаноўныя папярэднікі ўмелі жартаваць. Дарма, што не зусім зграбна. Першы блін... Але рэшткі іх вопыту можна скарыстаць і зараз. Вось паглядзіце, які тонкі падыход знайшлі яны для адлюстравання (крытыкі?) студэнцкага жыцця.

**1. Кажуць, што на 3-м паверсе сямейнага інтэрната скора абваліцца столь, а Праўленне ЖАКТа вельмі перагружана і чакае, пакуль работы будзе менш, а потым ужо...**

**2. Кажуць, што Вайсковы габінэт ранішнюю фізкультурную зарадку з свайго пляну выкінуў, а штатнага працаўніка дзеля гэтае мэты трымае. Трэба ж выконваць па каштарысу такі пункт.**

**3. Кажуць, што партгабінэт вядзе вялікую падрыхтоўку да 30—31 (новага) навучальнага года... Праца яго абмяжоўваецца пакуль што вывешваннем аб'яў.**

**4. Кажуць, што загадчык пральні выдае чыстую бялізну на другі дзень пасля лазні, а брудную прымае ў час акадэмічных заняткаў.**

**5. Кажуць, што лесанарыхтоўчыя цяжкасьці выкліканы ўтварэннем драваных фондаў у пакоі тт. Слаўковіча і Аксёнава.**

**6. Кажуць, што ў пакоі Алізарэвіча шафа існуе дзеля збору ўцільсыравіны і тары.**

**7. Кажуць, што Адасёў імкнуўся «гегелеўскай дыялектыкай» даказаць брыгадзе непатрэбнасць санітарнага налёту.**

Наталля ЖУК.

Зараз, рыхтуючыся да чарговага працоўнага семестра, трэцякурснік гістфака Пётр Аксючыц, камандзір СБА імя акадэміка М. М. Нікольскага, напэўна не раз успамінае чэрвень 1977 года, калі ён разам з сябрамі-аднакурснікамі ўпершыню атрымаў будатрадаўскую форму і эмблему байца першага на факультэце эксперыментальнага археалагічна-рэстаўрацыйнага атрада...

# Наперадзе — БАМ

У працы, у сумесных цікавых справах скоўваўся калектыў, нарадзіўся атрад. Зараз камандзір добра ведае кожнага з байцоў...

**Падрыхтоўчы перыяд гэтага года байцы атрада імя акадэміка М. М. Нікольскага сустрэлі з уздымам. І зразумела, наперадзе — БАМ! Туды паедуць лепшыя з лепшых.**

**Ужо праведзены тры сходы, апошні з якіх выліўся ў мітынг пратэсту супраць кітайскай агрэсіі ў В'етнаме. На сходзе байцы атрада аднадушна прынялі зварот да ўсіх байцоў усесаюзнага студэнцкага будаўнічага атрада імя Ленінскага камсамола правесці ў падрыхтоўчы перыяд камуністычны суботнік салідарнасці з сацыялістычным В'етнамам. А грошы, якія будуць зароблены ў гэты дзень, пералічыць у фонд народа СРВ. У цяперашні час дзейнасць атрада праходзіць на аснове распрацаванага плана, па якому прадугледжана правесці тры суботнікі, сабраць 60 кніг і перадаць іх падшэфнай школе. Створана лектарская група ў саставе 10 чалавек. Намечана за падрыхтоўчы перыяд прачытаць 25 лекцый, з якіх 10 ужо прачытана.**

А. ХАЛЕЦКІ.

*(22 сакавіка 1979 г.)*

# Першыя выкладчыкі БДУ

Адной з галоўнейшых цяжкасцей у арганізацыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта была адсутнасць у рэспубліцы навуковых і педагагічных кадраў для вышэйшай школы.

Урад РСФСР аказаў Савецкай Беларусі вялікую дапамогу. Народным камісарыятам асветы РСФСР былі накіраваны ў Мінск відныя вучоныя з Маскоўскага, Петраградскага, Казанскага і іншых універсітэтаў.

Сярод прафесараў, што прыехалі на работу ў Беларускі дзяржаўны універсітэт, былі вядомыя спецыялісты У. І. Пічэта (гісторыя), М. Б. Кроль (нервовыя хваробы), І. М. Салаўёў (педагогіка), У. М. Іваноўскі (філасофія), М. М. Нікольскі (гісторыя рэлігіі і старажытнага Усходу), У. М. Перцаў (усеагульная гісторыя), Б. М. Беркенгейм (арганічная хімія), М. А. Янчук (этнаграфія), У. М. Дзякаў (заходнееўрапейская гісторыя), А. Н. Вазнясенскі (руская літаратура) і іншыя.

Народны камісарыят асветы РСФСР і ў наступныя гады пасылаў у БДУ буйных спецыялістаў, якія забяспечвалі чытанне лекцый па ўсіх вядучых дысцыплінах.

Многія з прафесараў, прыехаўшых у Мінск (М. М. Нікольскі, У. М. Перцаў, М. А. Прыляжаеў і іншыя) назаўсёды звязалі сваё жыццё і дзейнасць з Савецкай Беларуссю і яе універсітэтам.

Пасланцы братняга рускага народа сваю навуковую, педагагічную і культурна-асветніцкую работу накіравалі на падрыхтоўку беларускай савецкай інтэлігенцыі, з асяроддзя якой пасля выйшлі вядомыя вучоныя, педагогі, відныя дзеячы народнай гаспадаркі і культуры рэспублікі.

Е. АБЕЦЭДАРСКАЯ.

*(3 красавіка 1970 г.)*

# Першыя студэнты БДУ

Савецкая ўлада шырока раскрыла дзверы Беларускага дзяржаўнага універсітэта перад рабоча-сялянскай працоўнай моладдзю. З розных канцоў Беларусі па камандзіроўках партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый прыйшлі ва універсітэт прагныя да ведаў юнакі і дзяўчаты — будучая беларуская савецкая інтэлігенцыя.

Студэнты першага набору выйшлі са сцен універсітэта ў 1925 годзе высокакваліфікаванымі спецыялістамі — педагогамі, юрыстамі, эканамістамі, медыкамі. Працуючы на розных участках народнагаспадарчага і культурнага будаўніцтва рэспублікі, яны заўсёды і ўсюды высока трымалі гонар роднага універсітэта.

Многія са студэнтаў першага выпуску і цяпер працуюць на карысць сацыялістычнай Радзімы.

Сярод іх — Іван Емяльянавіч Лакін — рэктар Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага. Дзмітрый Іванавіч Серко — вучоны сакратар аддзялення грамадскіх навук АН БССР.

Некаторыя са студэнтаў першага выпуску пайшлі на заслужаны адпачынак, але не спынілі творчай дзейнасці. Так, пенсіянеры — вядомы беларускі бібліёграф Юлія Іосіфаўна Бібіла і былы загадчык беларускага аддзела Дзяржаўнай бібліятэкі імя У. І. Леніна Адам Антонавіч Сакольчык у мінулым годзе апублікавалі «Бібліяграфію па гісторыі Беларусі» — працу вялікай навуковай каштоўнасці...

Е. АБЕЦЭДАРСКАЯ.

*(10 красавіка 1970 г.)*

# Традыцыйны студэнцкі

У верасні 1954 года па ініцыятыве ЦК камсамола Беларусі быў арганізаваны першы Дзень мінскага студэнта. Гэтае цікавае свята моладзі адзначалася яшчэ некалькі разоў, але потым чамусьці наступіў перапынак. І вось у мінулую нядзелю тысячы студэнтаў сталіцы рэспублікі і запрошаныя з іншых гарадоў госці запоўнілі вуліцы і Цэнтральную плошчу Мінска.

...Пасля ўрачыстага адкрыцця (дарэчы, у гэтым прынялі ўдзел прынцэса Стыпендыя, бабуля Лекцыя, прыгажуня Шпаргалка, зладзейка Сесія, граф Семінар і бог Навукі) пачалося грандыёзнае факельнае шэсце. Чатырыста юнакоў і дзяўчат неслі факелы, запаленыя ад вечнага агню ля помніка Перамогі. Шэсце накіроўваецца да плошчы Леніна. Тут, ля помніка Ільічу, адбыўся ўрачысты мітынг...

Да падножжа помніка Ул. І. Леніну кладуцца жывыя кветкі. На мітынгу прымаецца зварот мінскага студэнцтва да ўсіх студэнтаў рэспублікі. Першы заклік гучыць па-ленінску: «Вучыцца, вучыцца і яшчэ раз вучыцца!» Студэнты сталіцы вырашылі ўвекавечыць памяць камсамольцаў-мінчан, загінуўшых у час Вялікай Айчыннай вайны, узяць шэфства над будаўніцтвам, стварыць новыя стадыёны, басейны, спартыўныя пляцоўкі, новыя паркі, скверы і алеі. «Верны сваім традыцыям студэнцкі камсамол Мінска аддасць усе сілы і энергію, каб моладзь Краіны Саветаў заўсёды, у любым выпрабаванні была дастойна легендарнай, бессмяротнай славы сваіх бацькоў», — гаворыцца ў звароце.

Студэнты Мінска заклікалі ўсіх сваіх сяброў у рэспубліцы ўсебакова рыхтавацца да слаўнага юбілею — 50-годдзя Савецкай улады з тым, каб сустрэць гэта свята новымі поспехамі ў вучобе, у грамадскай дзейнасці і ў працы на карысць Радзіме. У выкананні сацыялістычных абавязацельств, якія цяпер распрацоўваюцца і зацвярджаюцца ў вну, сваё слова павінны сказаць і студэнты.

Да позняга вечару працягвалася святкаванне, яно прадоўжылася і ў інстытутах, дзе адбыліся сустрэчы па інтарэсах.

*(21 кастрычніка 1966 г.).*

ПРАБЛЕМЫ І МЕРКАВАННІ

# АДЗНАКА ШЭРАЯ...

Самая складаная фігура ў студэнцкім асяроддзі — троечнік. Нават з двоечнікамі лягчэй — іх самым банальным чынам выключаюць з ВНУ. А вось троечнік... Яго даследвалі і не аднойчы, не скрывалі трывогі — пасрэдныя веды, значыць, у будучым пасрэдны спецыяліст. Ён у нас даўно разабраны на састаўныя, «раскладзен» па катэгорыях:

ТРОЕЧНІК-ГУЛЬТАЙ або скатваецца да двоечнікаў, або праяўляе сілу волі і вучыцца на стыпендыю. У першабытным сваім стане часцей за ўсё ВНУ не заканчвае.

ТРОЕЧНІК-НЕАРГАНІЗАВАНЫ. Мае падвід — недысцыплінаваны. Такога неабходна вучыць вучыцца, вучыць арганізоўваць сваю працу ў ВНУ.

ТРОЕЧНІК-ГРАМАДСКІ РАБОТНІК. Траціць на выкананне грамадскіх паручэнняў не толькі ўвесь вольны час, але і час лекцый.

ТРОЕЧНІК З ПРЫНЦЫПАМ «АБЫ ДЫПЛОМ». Мешчанін у студэнцтве. Самы злосны тып, бо займае ўсе пяць год чужое месца...

С. ШЫДЛОЎСКАЯ.

*(28 красавіка 1977 г.)*

ВЕСТКІ З СЕСІІ

# Медаліст атрымлівае двойку

Усе хваляванні засталіся ззаду. Ён — В. Берзін — стаў студэнтам першага курса фізічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна. Фу, здарова! Праўда, яму пашанцавала — у яго залаты медаль. Пачаліся будні. Лекцыі, практычныя. Трэба было займацца. Кнігі чакалі, калі дакрануцца да іх рукі дапытлівых і цікавых. Але наш герой раптам захандрыў. «Не хачу вучыцца,— сказаў ён.— Пайду лепш на завод, папрацую». «Дзівак»,— гаварылі аднакурснікі. І ў адзін голас запэўнівалі: «Слухай, ты ж здольны хлопец. Нас усіх за пояс запхнеш». Але хлопец не слухаўся.

Да сесіі ён прыйшоў, не перагарнуўшы ніводнай старонкі падручніка. І праваліўся. У першай у студэнцкім жыцці сесіі два «нездавальняюча».

Чаму? Чаму здольны юнак, скончыўшы школу з залатым медалём, атрымлівае нездавальняючыя адзнакі? Калі жадаў працаваць, дык ва універсітэт не трэба было паступаць.

А калі не хочаш вучыцца — пакідай універсітэт, не займай дарэмна месца.

*(30 студзеня 1959 г.).*

# Не так дапамагаюць, Света

Бадай што ніхто з выкладчыкаў нашага факультэта не скажа нічога благога пра Святлану Дамарацкую. Але вось на экзамене па гісторыі КПСС яна зайшла ў экзаменацыйны пакой. Нязначным пытаннем адцягнуўшы ўвагу экзаменатара, Света паспрабавала перадаць шпаргалку Грэце Лапо.

Нам вядома, што студэнты часам свядома ідуць на ашуканства экзаменатара. Больш таго, многія з іх лічаць перадачу шпаргалкі своеасаблівым праяўленнем таварыскасці і студэнцкай салідарнасці. Але ці ж гэта так? Хіба так, Света, трэба было дапамагаць Грэце? Нават калі б ёй з тваёй дапамогай удалося падмануць экзаменатара, недахоп ведаў усё роўна сказаўся б рана ці позна.

m-) Спрабавалі карыстацца шпаргалкамі і некаторыя студэнты першага курса на экзамене па геалогіі агульнай і гістарычнай. Прычым некаторыя з іх загадзя пісалі шпаргалкі. Падрабязны «канспект» сваіх будучых адказаў склала Людміла Каляда. Здаралася, і так, што асобныя слаба падрыхтаваныя студэнты спрабавалі ўздзейнічаць на экзаменатара рознымі просьбамі і хітрыкамі. Анатоль Чахоўскі, праваліўшы экзамен, трагічна заявіў прафесару Фурсенку:

— Калі вы мне паставіце двойку, я пакончу з сабой.

Падобныя факты павінны стаць прадметам самага сур'ёзнага абмеркавання камсамольскімі органамі.

І. І. ТРУХАН,
дэкан геафака.

*(11 мая 1960 г.)*

# Бярыце прыклад з камуністаў

Зноў сесія... Зноў каля дзвярэй аўдыторыі студэнты чакаюць чаргі для здачы экзамена, хвалююцца і радуюцца...

Здаецца, усё ведаеш, а ўсё ж адчуваеш, што ў адным з месц не давучыў як патрэбна. А раптам якраз гэта пытанне і трапіцьʔ..

Нават Фёдар Пятровіч, і той гаворыць:

— Здаецца, нічога не ведаю...

Фёдар, безумоўна, ведае і ведамі сваімі ахвотна дзеліцца з аднакурснікамі. Сёння перад здачай гісторыі КПСС каля яго сабралася цэлая купка. Ідзе апошняя перадэкзаменацыйная «кансультацыя».

Адзін за другім здаюць студэнты. Падыйшла чарга і да Фёдара. З хваляваннем выцягнуў ён білет. «Ведаю ўсё»,— падумаў пра сябе. Адказваў упэўнена, грунтоўна. Па заслугах атрымаў Фёдар адзнаку «выдатна».

Георгій Рылюк захварэў у самым пачатку падрыхтоўкі да экзаменаў. І тым не менш за два дні паспеў паўтарыць увесь матэрыял. Другі не пайшоў бы здаваць. Але Георгій не хацеў адставаць ад таварышаў. І здаў на чацвёрку.

Камуніст Фёдар Пятровіч і кандыдат КПСС Георгій Рылюк паказваюць прыклад усюды. Сваю першую сесію Фёдар здаў на выдатна, Георгій — на добра.

...У цэлым на экзаменах па гісторыі КПСС студэнты І курса геаграфічнага факультэта паказалі трывалыя веды. Іх адказы сведчылі аб тым, што яны добра ведаюць шлях нашай роднай Камуністычнай партыі.

А. РУСІНОВІЧ.

*(22 мая 1959 г.)*

# «ПРЫВІДАЎ» — ЗА КАЎНЕР

Познім вечарам у інтэрнаце ўсё паступова сціхае: і хрыплы лямант магнітафонаў, і звонкі смех дзяўчат, і гудзенне ліфта.

Але прыслухайцеся, і вы пачуеце іншыя, загадкавыя гукі: стогн паркета, скрып дзвярэй, шорганне. Хто гэта? Не палохайцеся, гэта самыя звычайныя прывіды выйшлі на свой начны промысел. Аказваецца, у наш век тэхнічнага прагрэсу ёсць і такія таямнічыя з'явы.

Прывіды — зусім як людзі з іх слабасцямі. Любяць часам пажартаваць. Напрыклад, бясшумна зняць у калідоры блока люстэрка і разам з ім хутка знікнуць. Іншы раз тую ж маніпуляцыю яны паспяхова праводзяць з покрыўкамі ад унітаза. Здаецца, навошта гэтым бясплотным вандроўнікам з таго свету такая празаічная рэч? Зноў жа ў пекле, адкуль з'явіліся прывіды, дастаткова святла ад кастроў, на якіх чэрці смаляць няшчасных грэшнікаў. І нікому там непатрэбны лямпачкі, а між тым яны знікаюць з блокаў. У рэшце, навошта прывідам пробкі ад ванны ў той час, калі, па апошніх звестках, Ціхі акіян нідзе не цячэ і працякаць не збіраецца, а таму жыхарам краіны Люцыфера не пагражае небяспека грандыёзнага патопу.

Раніцай студэнты прачынаюцца і з жахам выяўляюць прапажу. Адразу пачынаецца паломніцтва па чужых пакоях.

Жарты прывідаў далёка заносяць люстэрка, пробкі, покрыўкі і іншыя малагабарытныя рэчы. Гісторыя з пакражай канчаецца тым, што абрабаваныя ўздыхаюць і складваюць грошы на новае люстэрка.

А што ж прывіды? Яны так жа скрыпяць і шоргаюць па начах. Ды толькі адно слабае месца ёсць у іх: захопленыя за сваёй паскуднай справай, яны раптам губляюць таямнічы выгляд і робяцца звычайнымі і вельмі напалоханымі зладзюжкамі. Трэба выкарыстоўваць гэтую ўласцівасць начных прывідаў за каўнеры!

П. ВАСЮЧЭНКА.

*(11 лістапада 1976 г.).*

# А гэта магло не здарыцца

Шумна запаўняецца 58 аўдыторыя. Студэнты хімічнага факультэта прыйшлі на камсамольскі сход. На павестцы дня адно пытанне: персанальная справа студэнта 4 курса Анатоля Пестрака. Адчуваецца, што сход будзе бурным. Пасля інфармацыі сакратара камітэта камсамола факультэта Герасімава на трыбуну ўзыходзіць юнак, нізка апусціўшы галаву.

— Так, я лічу сябе віноўным,— гаворыць ён.— У мяне не хапіла смеласці і прынцыповасці парваць з маральна разлажыўшайся групай Хадзеева. Я заслугоўваю суровага пакарання, але не лічу сябе чалавекам кончаным.

Аказалася, што Анатоль выпадкова пазнаёміўся з Хадзеевым яшчэ ў 9 класе і падтрымліваў з ім сувязь, як ён выразіўся, ад няма чаго рабіць. Збіраліся ў Хадзеева, гулялі ў бязглуздую гульню «лухта».

Адзін за адным выступаюць студэнты, аспіранты, выкладчыкі. Амаль усе выступаючыя абураюцца паводзінамі Анатоля.

— У здарыўшымся віноўны бацькі Анатоля,— сцвярджае першакурснік Ігнаценка.— Яго выхоўвалі ў цяплічных умовах, ён не ведаў цяжкасцей і не ведае, што такое праца.

... Анатоль павінен быць выключан з камсамола і універсітэта — такі погляд выступаючых.

Студэнты Ласкоў і Макатун лічаць, што дастаткова суровай вымовы.

Большасцю галасоў Анатоль Пястрак выключаецца з радоў ВЛКСМ. Прымаецца рашэнне прасіць рэктарат аб выключэнні Пестрака з універсітэта на два гады...

У здарыўшымся, безумоўна, больш за ўсіх вінаваты сам Анатоль, яго бацькі. Але не меншая віна кладзецца на калектыў, у якім жыў Анатоль. На факультэце, вядома, маглі не ведаць аб сувязях Анатоля. Але як аб гэтым не ведаць у групе? Як можна сядзець з таварышам за адным сталом на працягу чатырох год і не ведаць, чым ён жыве, аб чым думае? Мае рацыю аспірант Браніцкі, які сказаў, што камсамольская арганізацыя хімфака не звяртае ўвагі на адасобленасць некаторых студэнтаў. Як бачыце, гэта часам вельмі дорага каштуе.

**Д. ШОХАН,**
член камітэта
камсамола.
універсітэта.
*(11 красавіка 1962 г.)*

### 36 ВЫСАКАРОДНЫХ СЭРЦАЎ

Так называецца невялічкая заметка ў нумары «Беларускага універсітэта», за 11 мая 1963 года. «Вялікая група студэнтаў нашага універсітэта...» — пачынаецца яна. А потым пералічваюцца 36 прозвішчаў тых, хто «зрабіў высакародны ўчынак, які сведчыць аб іх высокім пачуцці сацыялістычнага гуманізма. Гэтыя 36 юнакоў і дзяўчат бясплатна далі сваю кроў для лячэбных мэт. Па хадайніцтву загадчыцы здраўпункта універсітэта тав. Мазавай, загадам рэктара ўсім 36 студэнтам аб'яўлена падзяка».

Сённяшнія студэнты-донары ў газеце не пералічваюцца. Падзяка рэктара ім не аб'яўляецца, ды й наўрад ці яна заахвоціла або ўзрадавала іх. За здачу крыві яны атрымліваюць 34—44 рублі (у залежнасці ад дозы). Бескарыслівасць даўно не ў модзе. На жаль, словазлучэнне «высакародныя сэрцы» — таксама.

# УСЁ МОЖНА ПАСПЕЦЬ

Вечар у нядзелю ў інтэрнаце па вуліцы Кірава. Бесперапынна стукаюць дзверы, нехта спяшаючыся прабягае па калідоры, часамі даносіцца смех. Адны вяртаюцца стомленыя з чытальнай залы, другія ідуць у кіно, тэатр.

У другакурснікаў юрыдычнага факультэта — калектыўны паход у тэатр. У арганізатара паходу Веры Палунінай яшчэ шмат клопатаў. Жадаючых схадзіць на «Эсмеральду» ў оперны тэатр аказалася больш, чым узялі білетаў...

Пасля спектакля яна рашыла прагуляцца з сяброўкай па вячэрняму Мінску. На вуглу праспекта імя Сталіна і вуліцы імя Янкі Купалы ўтварылася ледзяная дарожка. У жывым калідоры гледачоў коўзаюцца на нагах смельчакі. Шум, смех, жарты, незласлівыя кпіны няўдачнікам, пракаціўшымся на асабістай спіне...

Дома ўжо перад самым сном Вера расказала Галі Шырокавай аб зямельнай рэнце, аб аснаўным эканамічным законе капіталістычнага спосабу вытворчасці, прыводзячы па памяці выказванні К. Маркса з першага тома «Капітала». І калі ўжо пакой спаў, Галя з палёгкай уздыхнула — незразумелае раней стала ясным.

А Вера задумалася аб сваім. Хутка праляцеў дзень. Заўтра трэніроўка ў лыжнай секцыі, потым трэба рыхтавацца да чарговага семінару па савецкаму дзяржаўнаму праву, перакласці тэкст з нямецкай. Гаспадарчыя пытанні таксама нельга адкладаць. Новыя клопаты, абавязкі, новыя радасці і новыя засмучэнні, без якіх немагчыма жыццё...

**Н. КЛІМЕНКА.**
*(7 лютага 1959 г.).*

# Тэлеграма цалінНікаў

У адрас камітэта камсамола БДУ прыйшла тэлеграма ад студэнтаў універсітэта, якія працуюць зараз на будоўлях Уральскай вобласці. Вось яе тэкст:

*«Мінск Белдзяржуніверсітэт Камітэт камсамола*

*Віншуем пачаткам навучальнага года Жадаем акуратна наведваць лекцыі і весці канспекты Чакайце нас Цаліннікі».*

**НЕ ПУЖАЙСЯ І НЕ ЗДЗІЎЛЯЙСЯ, ПАВАЖАНЫ ЧЫТАЧ. ВЕРСТКА І ЗМЕСТ СЕННЯШНЯГА РАЗВАРОТУ НАШАЙ ГАЗЕТЫ САПРАЎДЫ НЕЗВЫЧАЙНЫЯ. ГЭТА — РЭТРА-ВЫПУСК. ВАМ ПРАПАНУЮЦЦА РАДКІ, НАДРУКАВАНЫЯ Ў «БЕЛАРУСКІМ УНІВЕРСІТЭЦЕ» Ў 30-Я, 60-Я І 70-Я ГАДЫ. МЫ НЕ МЕЛІ МЭТЫ ПРААНАЛІЗАВАЦЬ ТОЕ, ШТО АДБЫВАЛАСЯ З УНІВЕРСІТЭТАМ І ЯГО ЛЮДЗЬМІ ТАДЫ. ПРОСТА ХАЦЕЛІ ЎСПОМНІЦЬ ЦІ НАГАДАЦЬ РАЗАМ З ВАМІ, ЯКІМІ БЫЛІ КАЛІСЬЦІ... МЫ САМІ.**
**МЫ ЗМЯНІЛІСЯ З ТЫХ ЧАСОЎ? ТАК. МЫ ЗАСТАЛІСЯ РАНЕЙШЫМІ? ТАК...**

# Камсамольская паверка

Гонар першым сярод ВНУ рэспублікі пачаць абмен камсамольскіх дакументаў выпаў нашаму універсітэту.

Абмен павінен стаць свайго роду аглядам сіл, праверкай таго, як кожная камсамольская арганізацыя выконвае рашэнні партыі. Ва універсітэце абмен камсамольскіх дакументаў пачнецца 1 сакавіка. У гэты дзень новыя членскія білеты саюза моладзі з сілуэтам Ільіча на чырвонай вокладцы будуць уручаны ўсім ленінскім стыпендыятам БДУ. Акрамя іх, права першымі атрымаць новыя білеты заслужылі байцы зімовага студэнцкага будаўнічага атрада імя 30-годдзя Перамогі.

...Падрыхтоўка да абмену ў поўным разгары. На факультэтах складзены спісы камсамольцаў па курсах, праходзяць камсамольскія сходы, прысвечаныя абмену.

**НАШ КАР.**
*(27 лютага 1975 г.)*

# Восьмае неба

Не здзіўляйцеся загалоўку, восьмае неба сапраўды ёсць у нас ва універсітэце і гаспадараць на ім рэальныя людзі. У вежы галоўнага корпуса на восьмым паверсе размешчана візуальна-аптычная станцыя назірання за штучнымі спадарожнікамі зямлі. Напярэдадні Дня касманаўтыкі мы падняліся ў яе ўладанні, каб узяць невялікае інтэрв'ю ў тых, хто арганізуе службу назіранняў і гэтым уносіць свой уклад у засваенне касмічнага прастору.

Начальнік станцыі, нядаўні выпускнік фізічнага факультэта Васіль Васільевіч Далінін расказвае крыху аб гісторыі станцыі. Яшчэ да запуска першага спадарожніка зямлі Астранамічны савет АН СССР арганізаваў падрыхтоўку назіральнікаў. І ўжо ў 1958 годзе наша станцыя ў ліку першых пачала дзейнічаць. А нядаўна, адзначаючы актыўны ўдзел у назіраннях за штучнымі спадарожнікамі зямлі на працягу дзесяці гадоў, Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і Астранамічны савет АН СССР узнагародзілі калектыў станцыі граматай.

Я прашу Васіля Васільевіча расказаць больш падрабязна аб рабоце.

— З вылічальнага цэнтра да нас паступае інфармацыя аб каардынатах і часе палёту спадарожніка. Наша задача ўдакладніць іх шляхам назіранняў. Рэзультаты паведамляем у вылічальны цэнтр.

Гэтыя весткі, якія паступаюць з розных куткоў Саюза, дзе размешчаны станцыі, падобныя на нашу, дазваляюць назіраць за змяненнямі арбіты спадарожніка з цягам часу. Ну, і дадаткова — судзіць аб шчыльнасці атмасферы, форме зямлі і г. д...

**А. НІКОЛЕНКА.**
(12 красавіка 1968 г.).

# Кафэ патрэбна

Мой сябар вучыцца ў Мардоўскім універсітэце. Прыехаў да мяне на Кастрычніцкія святы. Схадзілі мы з ім у тэатр, хацелі дзе-небудзь патанцаваць, але... Тады ён кажа: «Пойдзем у кафэ. У нас ва універсітэце ёсць студэнцкае кафэ. Кожную суботу збіраецца моладзь, каб весела адпачыць, прыняць удзел у конкурсах, паспрачацца, падыскусіраваць. А ў вас?»

Я прамаўчаў. Толькі падумаў, што гэта вельмі добра — сваё студкафэ. Можна было б зрабіць эстраду — на электрагітарах ігралі б нашы хлопцы. А ўсё астатняе — як на тэлевізійным «Блакітным агеньчыку».

Па-мойму, можна было бы часткова вырашыць праблему знаёмства юнакоў і дзяўчат. А то сапраўды, дзе пазнаёміцца са студэнтамі іншых факультэтаў? . У інтэрнатах танцы рэдкія, ды я, увогуле, у інтэрнаце не жыву. А ў бібліятэцы ўсе заняты справамі. Вось вечарамі і блукаеш па кінатэатрах.

Дзе арганізаваць такое кафэ? Можна ў адным з інтэрнатаў. Калі атрымаецца добра, будуць прыходзіць студэнты адусюль, і ўсім будзе весела.

А так — сумнавата: лекцыі ды бібліятэка. А дадому ж часта ездзіць не будзеш. Калі ўжо газета напісала пра магчымасць арганізацыі студкафэ, то мая думка такая: яно патрэбна і неабходна.

**А. КАСАРОЎ,**
студэнт.
*(31 сакавіка 1977 г.).*

# Аб'ява з каментарыямі

На дошцы аб'яў у галоўным корпусе з'явілася цікавае запрашэнне. Студэнтам універсітэта паведамлялася, што секцыя турызма-альпінізма «организовывает походы по Архангельской губернии и Белоруссии». З якіх гэта часоў наша слаўная Архангельшчына стала не вобласцю, а губерніяй? Жарты жартамі, а гэтае слова ніяк не падыходзіць да радзімы Міхаіла Васільевіча Ламаносава, таксама як і да любога куточка нашай неабсяжнай Радзімы. Так што, сябры турысты-альпіністы, «арганізовываць» паходы «арганізовывайце», а пра геаграфію не забывайце, ды і пра граматыку таксама.

**Даніла ШЫЛА.**
*(25 студзеня 1963 г.)*

ЛІСТОК ДАІ

# Коўзкі студзень

...Зараз, калі ў мінскіх ВНУ пачынаецца экзаменацыйная сесія завочнікаў, вельмі важна звярнуць увагу іншагародніх студэнтаў на правілы паводзін на вуліцы. Гэтых правілаў трэба строга прытрымлівацца, бо бестурботнасць, няўважлівасць могуць прывесці да сумных вынікаў.

**М. АЛІСІЕНАК,**
старшы інструктар
ДАІ УУС
Мінгарвыканкома.
*(30 студзеня 1975 г.)*

# ДОНЖУАН З МЯДЗЕЛЬШЧЫНЫ

АБ ТЫМ, што Станіслаў Каліцкі любіць прыгоды, ведаюць не толькі на Мядзельшчыне. Такая ўжо ў яго натура: хлебам не кармі, а дай чалавеку пазабаўляцца, пахадзіць, як кажуць, на галаве.

У вёску Нагаўкі, дзе Каліцкі працаваў выкладчыкам, прыехалі маладыя супругі, настаўнікі Іван Міхайлавіч і Анісся Іванаўна Вялі. На кватэру сталі ў пажылых калгаснікаў, і тыя абрадаваліся маладым людзям, як родным дзецям, зайздросцілі іх згодзе, любаваліся на іх...

Толькі Каліцкі не мог спакойна глядзець на чужое шчасце, хоць і вельмі блізка сыйшоўся з сям'ёй Вяляў. Аднойчы, калі гаспадара не было дома, Каліцкі прыняў выгляд самага няшчаснага на зямлі чалавека і бразнуўся ніц перад Аніссяй Іванаўнай:

— Родная, мілая Анісся! Я кахаю цябе! Кахаю на ўсё жыццё! Цябе, толькі цябе адну! Пашкадуй мяне, не мучай!

Кажуць, што кропля камень точыць. Так здарылася і з Аніссяй Іванаўнай. Яна засумнявалася:

— А ці шчаслівая я з Іванам Міхайлавічам?

— Не, не і не! — лепятаў на самое вуха Каліцкі.— Толькі са мною!

— А ці падыходзіць мне Іван Міхайлавіч?

— Толькі я,— расплываўся Station.— Ты будзеш шчаслівай, любая! Я так буду цябе кахаць!

Хутка ў сям'і Вяляў запахла скандаламі, справа дайшла да суда.

— Хохмачкі! — цешыцца Станіслаў.— Справа зроблена! Шукай, Анісся Іванаўна, ветру ў полі.

І ў той час, калі ў нарсудзе слухалася справа аб скасаванні шлюба Вяляў, Каліцкі не драмаў у шапку. Ён выбіраў сабе новую ахвяру. Ёй аказалася маладая настаўніца Зінаіда Сяргееўна Шарамет. Не змагла яна ўстаяць перад чароўнымі словамі Каліцкага.

І хоць на вёсцы пра Станіслава ніхто не мог сказаць добрага слова — Зіна паверыла, паверыла так, як можа паверыць той, хто гатоў дзяліць з любым усё: і радасць, і гора, і смутак, і шчасце.

Калі ж адносіны з Зінай зайшлі вельмі далёка, Каліцкі сцяміў:

— Пара зматваць вуды, а то і падгарэць можна.

На справе гэта азначала — перавесціся з завочнага аддзялення на стацыянар. Сказана — зроблена. І вось Каліцкі — студэнт 3 курса беларускага аддзялення філфака. Назад у Нагаўкі яго і на вяроўцы не зацягнеш.

Але Зіна, не дачакаўшыся свайго «суджанага», прыехала ў Мінск сама.

— Я хутка буду маці, Стасю! — з радасцю паведаміла яна.

— Што-о-о? — вочы Каліцкага зрабіліся квадратнымі.— Ты маеш розум? Зрабі што-небудзь, пакуль не позна.

Куды дзеліся нядаўнія пяшчота і шчырасць. Перад Зінай стаяў раз'юшаны, агідны і зусім чужы чалавек.

А Каліцкі адчуў, што не мінаваць навальніцы, і зрабіў спробу замесці сляды. Пад покрывам ночы, убраўшы галаву ў плечы, прабіраўся ён да вёскі.

Так жа асцярожна выходзіў і з вёскі. План удаўся...

Але дарэмна спрабаваў замятаць сляды Каліцкі, дарэмна рабіў вялікія вочы і ў дэканаце, і на камсамольскім сходзе. На гэты раз яго «артыстычныя здольнасці» не дапамаглі.

Гадзюкай круціцца Каліцкі, хапаецца за кожную дробязь:

— Не вінаваты я, не дакажаце, што дзіця маё. Не маеце падстаў.

Сказаў гэта спакойна, абыякава, быццам справа ішла не аб будучым дзіцяці, а аб пераблытаных у гардэробе галёшах. Цікава, адкуль такое ў чалавека, які збіраецца стаць выхавацелем? Ці ж мае ён, урэшце, на гэта права?

Не хацеў адказваць Каліцкі за свае ўчынкі, не знаходзіў смеласці прызнацца ў факце сваіх агідных паводзін. Гэта зрабіў за яго камсамольскі сход. Каліцкі панёс заслужанае пакаранне. Хай яно стане ўрокам для тых, хто яшчэ, падобна Каліцкаму, лічыць донжуанства мэтай свайго жыцця.

**Л. КУЗЬМІЦКІ,**
**В. ЖВАЛЕЎСКІ.**
(18 красавіка 1962 г.).

Неверагодна

# ЖЫЦЦЁ ПАСЛЯ ЖЫЦЦЯ

**ДОКТАР МУДЗІ НЕ БЫЎ ПЕРШЫМ, КАГО ЗАЦІКАВІЛА ГАЛОЎНАЕ ПЫТАННЕ ЧАЛАВЕЧАГА ЖЫЦЦЯ — СМЕРЦЬ. ДА ЯГО НАД ГЭТАЙ ПРАБЛЕМАЙ ПРАЦАВАЛІ ДОКТАР Е. КЮБЛЕР-РОС З ЧЫКАГА, ЯШЧЭ РАНЕЙ — КАРЛ ГУСТАЎ ЮНГ, ПРАФЕСАР ВОЙНА-ЯСЕНЕЦКІ, ДОКТАР ГЕАРГ РЫЧЫ І ІНШЫЯ ВУЧОНЫЯ.**

**ДА 1980 ГОДА БЫЛО ВЯДОМА БОЛЬШ ЗА 25 ТЫСЯЧ ВЫПАДКАЎ ВЯРТАННЯ ДА ЖЫЦЦЯ НЯДАЎНА ПАМЕРШЫХ. СЕННЯ ІХ ЯШЧЭ БОЛЬШ. ВУЧОНЫЯ ПРАПАНОЎВАЮЦЬ РАЗМЕЖАВАЦЬ ДЗВЕ СТАДЫІ ЎСПРЫМАННЯ ПАМЕРШЫХ: АЎТАСКАПІЧНАЕ — ТОЕ, ШТО ДУША БАЧЫЦЬ, ЧУЕ І АДЧУВАЕ НЕПАСРЭДНА ПАСЛЯ ВЫХАДУ З ЦЕЛА, КАЛІ ЯНА ЗНАХОДЗІЦЦА ЯШЧЭ ТУТ, У НАШЫМ СВЕЦЕ, І ТРАНСЦЭДЭНТАЛЬНАЕ — УСПРЫМАННЕ ДУШЫ, ЯКАЯ АДЫШЛА НА «ТОЙ СВЕТ».**

## На «тым» баку

Спынена дыханне ў жанчыны. Рэанімацыя. Потым яна расказала:

*«Я бачыла, як яны імкнуліся ажывіць мяне. Усё гэта было вельмі дзіўным. Я была вышэй за іх і быццам узіралася на іх зверху... Я размаўляла з імі, але ніхто не заўважаў мяне. Дактары і сёстры калацілі маё цела. Я казала ім: «Пакіньце мяне, я хачу застацца адна...» Але яны мяне не чулі. Тады я паспрабавала адштурхнуць іх рукі, але нічога не атрымлівалася. Я не адчувала ціску іх рук».*

Часам душа, якая ўзнялася над целам, можа раптам імгненна перанесціся ў іншае месца. Цяжка паранены ў В'етнаме салдат у час аперацыі пакінуў цела і назіраў за спробамі вярнуць яго да жыцця. *«Я хацеў спыніць гэтыя спробы, таму што там, дзе я быў, мне было добра. А потым я раптам апынуўся на полі, дзе мяне паранілі. Санітары падбіралі маіх сяброў. Я хацеў дапамагчы ім, але зноў апынуўся ў аперацыйнай».*

Амаль усе, хто перанёс стан часовай смерці, гавораць пра нейкую цёмную закрытую прастору, а потым з'яўленне яркага святла. Памёршы імкнецца да яго.

Магчыма, цёмны тунель падзяляе ўспрыманне гэтага свету ад таго. Святло — пачатак чароўнай прыгажосці.

Тыя, хто знаходзіўся ў стане часовай смерці даўжэй, расказваюць прыкладна тое ж самае, але, акрамя гэтага, і зусім іншае.

*«...Я ведаў, што паміраю. Я не быў у сваім целе, таму што бачыў яго на аперацыйным стале. З-за гэтага я адчуваў сябе вельмі дрэнна, але потым з'явілася гэтае яркае святло. Я адчуў яго цеплыню. Святло пакрывала ўсё, але не перашкаджала мне бачыць аперацыйную і дактароў. Спачатку я не разумеў, што адбываецца, але потым яно спытала мяне, ці падрыхтаваўся я да смерці. Голасам гаварыла святло. Цяпер я думаю, што голас зразумеў, што я не гатовы да смерці. Але з таго моманту, калі святло пачало гаварыць, мне зрабілася вельмі добра. Я адчуваў, што я ў бяспецы і мяне любяць».*

Аб святле пішуць таксама Азіс і Харальдсан. Тым, хто спрабаваў апісаць гэтае святло, было цяжка знайсці словы. Цікава, што ў «Тыбецкай Кнізе Памёршых» таксама пішацца пра сустрэчу са святлом, набліжаючыся да якога трэба імкнуцца адчуваць да іншых толькі любоў і сімпатыю.

Многія расказвалі аб сустрэчах з памёршымі роднымі ці знаёмымі. Яны заўсёды бачылі памёршых і ніколі — жывых. Адна жанчына бачыла сваіх родных, якія паціскалі ёй рукі. Яны былі апрануты ў белае, радаваліся і выглядалі шчаслівымі... «і раптам павярнуліся да мяне спіной, пайшлі, а бабуля сказала: «Мы ўбачым цябе потым, не ў гэты раз».

Часам нядаўна памёршаму даецца магчымасць выбару: застацца ці вярнуцца ў зямное жыццё. Часам супраць жадання памёршых ім загадваюць вярнуцца. Адна з пацыентак доктара Мудзі ўспамінае: *«Я апынулася ў чорнай пустэчы. Я ведала, што я пакінула сваё цела і паміраю, але ж паявіўся мой дзядзька Карл, які памёр многа гадоў таму назад. Ён загадаў: «Вяртайся. Твая справа на зямлі яшчэ не закончана». Супраць свайго жадання яна вярнулася ў цела. У яе быў маленькі сын, якому яна была патрэбна.*

Некаторыя лічаць, што вяртанне было вынікам іх уласнага рашэння. Іншыя — што Бог дазволіў ім вярнуцца і жыць яшчэ, таму што просьба аб жыцці не была эгаістычнай. Былі і такія, хто вярнуўся насуперак жаданню. Спробы супраціўлення не дапамагалі. Нейкая сіла цягнула назад, здаралася, праз чорны тунель.

Вяртанне ў цела часам адбываецца імгненна. Ёсць расказы пра тое, як чалавек, які назіраў збоку за спробамі ажыўлення свайго цела, у момант прымянення электрычнага тока раптам вяртаўся ў сваё цела. Часам перад вяртаннем бывае кароткая страта свядомасці. Урачы-рэаніматары адзначаюць, што ў момант вяртання да жыцця чалавек часта пачынае чхаць.

Расказы аб перажытым на «тым баку» шчырыя і падобныя, адрозніваюцца толькі ў дэталях. Людзі розных узроўняў адукацыі, розных прафесій, нацыянальнасцей, полу, узросту гавораць пра адно і тое ж. Гэта здзіўляла ўсіх вучоных, якія займаліся данай праблемай. Неадукаваная жанчына бачыла і перажывала тое ж самае, што і прафесар псіхалогіі. Нягледзячы на іх шчырасць, гэтыя паведамленні ўсё яшчэ не былі абсалютна доказальнымі, таму што ў многім грунтаваліся на расказах людзей, якія прайшлі праз часовую смерць. Не хапала аб'ектыўнай навуковай праверкі — ці існуе ў сапраўднасці феномен працягу жыцця пасля смерці цела.

## Крок да ісціны

Наступны крок зрабіў доктар Сабом. Ён арганізаваў праверачныя назіранні і пацвердзіў, а па сутнасці даказаў, што паведамленні аб жыцці пасля смерці не летуценні і што асоба пасля смерці цела сапраўды працягвае існаваць, захоўваючы здольнасць бачыць, чуць, думаць і адчуваць.

Доктар Міхаіл Сабом — прафесар медыцынскага факультэта ва універсітэце Эмары ў Злучаных Штатах Амерыкі. Ён спецыяліст-кардыёлаг, член Амерыканскага таварыства кардыёлагаў і мае вялікі практычны вопыт рэанімацыі. У кнізе «Успамін пра смерць» доктар Сабом пацвердзіў тое, пра што пісалі іншыя, але галоўнае, ён правёў шэраг даследванняў, параўноўваючы расказы сваіх пацыентаў, якія перажылі часовую смерць, з тым, што практычна адбывалася ў той час, калі яны знаходзіліся «на тым баку» і што можна было праверыць. Доктар Сабом вырашыў паглядзець на дзіўныя паведамленні сваіх пацыентаў вачыма аб'ектыўнага даследчыка. Асабіста ім праверана 116 выпадкаў. Напрыклад, ён правяраў, ці знаходзіліся апісаныя пацыентамі людзі ў пакоі для наведвальнікаў і ў які менавіта час. Ён складаў дакладныя пратаколы з улікам месца, часу, удзельнікаў, вымаўленых слоў і г. д. Для сваіх назіранняў ён выбіраў толькі псіхічна здаровых і ўраўнаважаных людзей. Праверка поўнасцю пацвердзіла існаванне вывучаемага феномену.

У той час, калі цела было мёртвым, людзі бачылі не толькі ўключаныя апараты, але і стрэлкі іх манометраў у тым становішчы, якое яны прымалі ў сапраўднасці, яны дэталёва і дакладна апісвалі машыны і прылады, якіх раней не бачылі, аб існаванні якіх ніколі не ведалі. Яны чулі гутаркі ўрачоў і сясцёр, назіраючы зверху, бачылі іх прычоскі і галаўныя ўборы, бачылі тое, што адбывалася за сценамі пакоя, у якім ляжала іх цела.



Для ілюстрацыі прыводзім некалькі прыкладаў з паведамленняў доктара Сабома.

Цяжкі сардэчны прыступ з прыпыненнем дзейнасці сэрца ў 44-гадовага мужчыны. Для ажыўлення давялося прымяніць некалькі электрычных шокаў. Пазней памёршы зрабіў дэталёвае апісанне.

*«Я быў убаку. Мяне гэта не цікавіла. Я назіраў, а не ўдзельнічаў. Перш за ўсё ўпрыснулі нешта праз гумку, потым паднялі мяне і паклалі на дошку. Адзін з дактароў пачаў біць па маіх грудзях. Яны раней давалі мне кісларод — такая гумавая трубачка для носа, цяпер яны яе дасталі і паклалі на твар маску, якая пакрывала рот і нос. Яна для ціску, светла-зялёнага колеру. Я памятаю, як яны ўкацілі столік, на якім было нешта накшталт лопасці. І таксама манометр з дзвюма стрэлкамі. Адна стаяла, другая рухалася павольна, першы раз яна дайшла да... паміж трэцяй часткай і паловай шкалы...»*

Персанал, які ўдзельнічаў у рэанімацыі, пацвердзіў гэты расказ ва ўсіх дэталях.

Другі выпадак: 60-гадовы рабочы, у якога таксама спынілася на час сэрца, успамінае: *«Я ўсё разумеў і бачыў маіх родных у прыёмным пакоі шпіталя. Яны стаялі там мая жонка, мой старэйшы сын, мая дачка, а таксама доктар... Не, не было ніякай магчымасці, каб я быў там, мяне ў гэты час апервравалі, але я бачыў іх і добра ведаў, што я быў там. Я не ведаў, што адбываецца і чаму яны так плачуць».*

Доктар Сабом распытаў пасля жану і дачку свайго пацыента, якія поўнасцю пацвердзілі яго расказ.

Расказы людзей, якія прайшлі праз часовую смерць, шчырыя і цікавыя. Ім хочацца верыць. Аднак таму, хто да гэтай пары ніколі сур'ёзна не думаў, што чакае яго пасля смерці, цяжка адразу згадзіцца з новымі данымі. Яны супярэчаць самому духу нашага часу і чалавеку, які жыве матэрыяльнымі інтарэсамі, здаюцца незвычайнымі і непраўдападобнымі. У выніку даследванняў высветлілася, што не ўсе людзі, якія былі блізкімі да смерці, сведчылі аб жыцці на «тым баку», большасць гаварылі толькі аб пустаце і страце свядомасці.

Ці азначае гэта, што толькі некаторыя з нас, а не ўсе, будуць мець другое жыццё? Аб'ектыўная навука адказаць на гэтае пытанне не можа. Аднак многія пацыенты не адказвалі, таіліся, магчыма, баючыся недаверу і кпінаў. Ды й самі мы, прачнуўшыся раніцай, ці заўсёды памятаем нашы сны?

Ці ёсць спробы знайсці для апісаных вышэй і, на першы погляд, дзіўных з'яў нейкія іншыя тлумачэнні? Ці можна тлумачыць іх не жыццём асобы ці душы, якая выйшла з цела, а як-небудзь інакш?

## Матэрыялісты — супраць

Ёсць. А дакладней, было мноства самых розных тэорый.

Крытыкі пачалі з таго, што тлумачылі ўсе гэтыя паведамленні летуценнямі, а працы вучоных — жаданнем выклікаць сенсацыю і зарабіць. Аднак з паяўленнем усё новых даных аб жыцці гэтыя абвінавачванні давялося пакінуць, таму што для ўсіх рабілася відавочным, што «нешта» ва ўсіх гэтых паведамленнях усё ж такі ёсць. А калі наяўнасць самога феномену была прызнана, пачалі адшукваць абавязкова матэрыялістычныя тлумачэнні.

Вядома, што некаторыя віды грыбоў утрымліваюць мескалін — рэчыва, якое здольнае выклікаць фантастычныя відовішча, часам падобныя на апісаныя вышэй. Тлумачылі гэтым, не думаючы пра тое, што мала хто з паміраючых ад вострай сардэчнай недастатковасці ці ў час сур'ёзных хірургічных аперацый еў перад гэтым атручваючыя грыбы.

Тлумачылі назапашваннем у крыві лішкаў вуглекіслаты, але праверка гэтага не пацвердзіла.

Тлумачылі недахопам кіслароду ў крыві — недахопу таксама не аказалася, а ў час аперацыі намаганнямі нарказатараў у крыві хворых быў хутчэй лішак кіслароду.

Тлумачылі ўздзеянне наркотыкаў і розных лекаў, хоць большасць асоб ніякіх наркотыкаў не атрымлівалі.

Былі спробы растлумачыць усё ўбачанае трызненнем. Выйшлі на сцэну і вучоныя-псіхолагі, псіхіятры, неўрапатолагі. Для тлумачэння былі прыцягнуты: галюцынацыі, канфабуляцыі, праекцыя падсвядомага ў свядомым, розныя падсвядомыя рэакцыі, свядомыя і падсвядомыя ўяўленні аб смерці, якія адлюстроўваліся ў форме зрокавых вобразаў.

Для аб'ектыўнай навукі ўсе гэтыя тлумачэнні і іх крытыка ўжо ў мінулым. Факты не аспрэчваюць, а за апошнія гады з'явілася столькі новых фактычных даных, што аспрэчваць іх проста немагчыма. Цяпер вучоным зразумела, што нейкая ўнутраная (нематэрыяльная?) частка чалавека можа выходзіць з цела і жыць па-за ім.

Зразумела, у Савецкім Саюзе апошнія дасягненні навукі аб смерці ўсё яшчэ замоўчваюцца. Іх не абмяркоўваюць, не ўспамінаюць, для шырокіх мас насельніцтва ўсё гэта пакуль яшчэ не існуе. На жаль, тая ж тэндэнцыя ўладарыць і ў вядучых дэмакратычных краінах. З навуковымі працамі не спрачаюцца, але ўпарта не жадаюць прыняць новыя факты. У якасці пункту апоры прымаюць, на першы погляд, праўдападобныя тэорыі. Усе чалавечыя ўспрыманні, свядомасць, разуменне, уся псіхіка — толькі ў мозгу. Мозг і свядомасць непадзельныя. Гэта сцвярджэнне мы ўспрымаем у якасці факта, на самай справе гэта толькі тэорыя. Каб пацвердзіць яе, часта спасылаюцца на працы вялікага рускага вучонага І. П. Паўлава, які быццам бы даказаў, што ўсе псіхічныя працэсы працякаюць толькі ў вялікіх паўшар'ях галаўнога мозгу. Гэтага Паўлаў ніколі не сцвярджаў і быў ён чалавекам глыбока веруючым.

Тэорыя псіхолагаў-матэрыялістаў аб тым, што мозг выдзяляе думкі падобна на тое, як печань выдзяляе жоўць, была, зразумела, смехатворнай з самага пачатку. Сур'ёзныя вучоныя імкнуліся ўсё ж такі прыйсці да нейкага разумення. Яны адзначалі, што розум не абавязкова звязаны з мозгам, а можа існаваць незалежна ад яго. Так, напрыклад, у немаўляці з неразвітым мозгам бываюць адчуванні і памяць мінулага. У вельмі маладога чалавека з неразвітым мозгам могуць быць бліскучыя матэматычныя ці музычныя здольнасці. Адкуль яны? Гэтыя веды і здольнасці не вельмі дакладныя, але яны ёсць.

Усё вышэй адзначанае можна падсумаваць такімі словамі: мозг — складанейшы апарат, але дзейнічае ён сумесна з розумам, у якога ёсць свая энергія. Зразумела, мозг ёсць прылада мыслення, але сама па сабе іграць яна не можа. Дух не ёсць функцыя мозга, а мозг ёсць прылада духу.

*Працяг чытайце ў нумары за 7 лістапада.*

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 5 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

24 кастрычніка
Зак. 2076.
Т. 1000 экз.

*220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.*
*ТЭЛЕФОН 20-68-27.*

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.